# «ВАЙНОЙ НАПІСАНЫ РАДОК»

Так называлася гісторыка-літаратурная эстафета, якая праходзіла ў народным літаратурным музеі нашага ўніверсітэта і была прысвечана памяці беларускіх пісьменнікаў – удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны.

Васіль Быкаў, Анатоль Вялюгін, Іван Шамякін, Янка Брыль, Мікола Сурначоў, Алесь Савіцкі, Алесь Жаўрук і многія іншыя айчынныя літаратары змагаліся на фронце, у партызанскіх атрадах, падполлі, працавалі ў франтавым друку. На жаль, не ўсе яны дажылі да светлага дня Перамогі. Але імёны гэтых творцаў навечна ўпісаны залатымі літарамі ў кнігу народнай памяці.

«На тэрыторыі Беларусі сёння пражывае 8412 ветэранаў. Іх сярэдні ўзрост складае 95 – 96 гадоў, – адзначыла выкладчык кафедры гісторыі Беларусі Юлія Мікалаеўна Бахір. – На жаль, з кожным днём усё менш застаецца сведкаў Вялікай Айчыннай вайны, якія могуць расказаць пра жудасныя падзеі таго часу. З другога боку, у гісторыі засталося нямала "белых плям" адносна гэтага перыяду. Напрыклад, немагчыма дакладна назваць колькасць людзей, якія загінулі ў гады вайны, даведацца, колькі нашых грамадзян супрацоўнічала з акупантамі, вызначыць, чаму на тэрыторыі нашай краіны было так шмат падпольшчыкаў і партызан».

Гасцямі мерапрыемства сталі члены Віцебскага абласнога грамадскага аб'яднання ваенна-гістарычнай рэканструкцыі «Товарищи по оружию». Клуб па інтарэсах існуе з 2005 года, яго сябры – актыўныя ўдзельнікі розных фестываляў, выстаў, рэканструкцый. Хлопцы і дзяўчаты арганізоўваюць інтэрактыўныя пляцоўкі, дзе прэзентуюць ваенную форму часоў Другой сусветнай вайны, здымаюцца ў дакументальных і аматарскіх фільмах.

Падчас паэтычнай хвіліны памяці студэнткі 2-га і 3-га курсаў філалагічнага факультэта расказалі пра нялёгкі жыццёвы шлях беларускіх пісьменнікаў у гады вайны і прачыталі іх вершы: «Мы не забудзем вас!» (Пятрусь Броўка), «Ліст да маці» (Мікола Сурначоў), «Шаснаццаць крокаў да заставы» (Алесь Жаўрук), «Цішыня» (Леанід Гаўрыловіч), «Пяць патронаў у абойме» (Аляксей Пысін), «Над брацкай магілай» (Аркадзь Куляшоў) і інш.

Уладзімір Антонавіч Папковіч, паэт і перакладчык, які выкладаў на кафедры нямецкай мовы нашай ВНУ, прыгадаў сваё дзяцінства. Ён расказаў, што некаторы час у іх доме жылі партызаны-радысты. Адзін з іх – Мікола Ваданосаў, будучы беларускі дзіцячы пісьменнік. Менавіта дзякуючы яму вершы Уладзіміра Папковіча трапілі ў рукі Рыгора Барадуліна і былі надрукаваны ў зборніку «Альманах». Напрыканцы свайго выступлення паэт прачытаў некалькі твораў.

Са сваімі вершамі, прысвечанымі вайне, выступіла і пісьменніца, старшыня Віцебскай філіі Саюза беларускіх пісьменнікаў, рэдактар універсітэцкай газеты «Мы і час» Анастасія Пятроўна Лазебная (псеўданім – Стася Наркевіч).

На наш погляд, гісторыка-літаратурная эстафета прайшла цудоўна. Кожны з прысутных даведаўся шмат цікавага і новага для сябе і, самае галоўнае, яшчэ раз пераканаўся ў тым, што трэба памятаць пра вайну, пісьменнікаў і ўсіх тых, хто абараняў нашу Радзіму і аддаў за яе сваё жыццё.

**Анастасія АЛЬХІМОВІЧ, Наталля ЕРМАКОВА, студэнткі 1-га курса ФлФ.**



На здымку: гістарычныя звесткі пра вайну прывяла Юлія Бахір.
Фота А. ДУБРОЎСКАЙ.